БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папрауляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 ру[illegible]
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 16. Менск. Чацьвер 11 красавіка 1918 г. Год I

Менск 11/IV.

Тры цэнтры.

Беларускае прэдстауніцтво у Менску, выбрана беларусамі, каторые знаходзілі, што павінна быць коаліцыя паміж беларускімі соцыялістамі і нацыянальнай дэмакратыей, прэдстауніцтво: стало на саюз з Літвой і Курляндзіей, адраджэнне старой нізалежнай беларуска-літоускай дзержаунасьці с тарговымі натуральнымі дарогамі да Балтыкі праз Лібаву, Рыгу і Неман.

Рада усебеларускаго конгрэсу, радзіушая сэкрэтарыят, логічна ішла на лініі узятай конгрэсам у той хвілі калі бушэвала рэвалюцыя. Прыняты былі, як усімі з'ездамі той эпохі самыя соцыялістычныя праграмы у сьвеці. Такія ужо былі кругом большэвіцкія дэкорацыі. Глауная работа і мэта з'езду быу ні соцыялізм, а збор зямлі беларускай. З'езд вынес пажадання зрабіць Беларускую рэспубліку. Вынес бы і нізалежнасць, каб яго ні разагналі на гэтым пункце большэвікі—цэнтралісты. Нейкіе эс-эры з Магілева вечная ім памяць, прывялі пяцьдесят тысяч руб. срэбрэнікау і вялі самую правакатарскую работу, каб між нісвядомымі беларусамі зрабіць партыю цэнтралістау проціу нізалежнасьці. Але у 1700 беларускіх прэдстаунікоу ідэя нізалежнасьці мела большасьць, тагды гэтыя людзі скамандавалі сваім прыяцелям, большэвікам, абарваць з'езд.

Прэдстауніцтво і сэкрэтарыят раздзеляюцца толькі тактыкай і нікаторымі пунктамі праграмы. Але час ляціць, міжнародныя варункі меняюцца і праграма робіцца для жыцця, а ні жыцце укладаецца у праграмное прокрустава ложэ. І надыйшоу час мец ні адзін соцыялістычны фронт, а адзін беларускі нацыянальны фронт.

Усе беларусы злучаюцца у адну сямью, бо яны хочуць ратаваць ні програмы і лезунгі, а нішчасную Бацькаушчыну. На іх адных ляжыць гэты гістарычны абавязак, за іх ніхто гэтаго ні зробіць.

Менскія земствы і гарадзкая дума, відзячы разьделеных беларусау,—у газэтах і пастановах пратэстуюць усе сьмялей і галасьней проціу нізалежнай беларускай дзержавы. Яны матывіруюць пратэст, што на гэта ні было волі народу і згоды суседніх дзержавау. У земстве і горадзе астауся «хвост» ад расійскай арміі, рожныя эс-эры і эс-дэкі, з «земгусароу", выбраныя салдатамі, катерым было дано право выбароу у мейсцовыя самоупрауления. Гласным думы састаіць і цень Карла Ляндэра, разгоншчыка беларускаго кангрэсу.

Дзіуная рэч—гэта пакрэвенства душы: і старая чорная сотня, і расійскія эс-эры і эс-дэкі, і большэвікі—усе бяруцца за рукі; калі трэба бараніць расійскі цэнтралізм і імпэрыялізм, злетае з іх чырвоны фігавы лісток «с самай соцыялістычнай праграмай на сьвеце».

Брацтва народоу! всемірная рэвалюцыя!... «і покарыце под нозе» цэнтралізму «всякаго врага і сэпаратысту»!.

Збау нас, Божэ, ад «земгусароу», а с беларускімі земцамі мы і самі справімся.

Чароднае заданне.

У працягу часу ад 1 сакавіка 1917 году Беларусь пасьпешна намагаецца выйсьці на дарогу дзержаунасьці, што дауно ужо выклікалася яе эканамічнымі і нацыянальна-культурнымі інтэрэсамі. Зьмены у агульнарасійскім палітычным жыццю, якія прыйшлі з рэвалюцыяй, здавалося, давалі ей магчымасьць зрабіць гэта. Аб'улено было право народау на самаазначэнне. Але рускія палітыкі, дбаючы аб цэласьці імпэрыі—хацелі самаазначыць народы зьверху і ні пазвалялі ім самаазначацца самым з нізу. Пачалася зацятая барацьба паміж імі і прэдстаунікамі нацыяу, каторыя бачылі наперад, што такім чынам,—як хочуць іх праціунікі парадку у Расіі ні зробіш і нацыяу самазнаачэням ні ашчасьлівіш. Час паказау, што прауда была на іх старане. Расія абэзсіленая паміж-станoвай барацьбой развалілася на дробныя часточкі, нізгодныя адна з другой нават у самой Вялікаросіі. З гэтаго распаду уратавацца здолела толькі адна Украіна, дасягнуушы сваей дзержаунасьці і нацыянальна-тэррыторыяльнай цэласьці. Беларусь «спазьнілася крыху», як пісалі нямецкія газэты і цяпер, калі на Украіне кіпіць ужо творчая праца, знайходзіцца зноу пры адных толькі бажаннях і ні з'ішчоных думках. А тым часам міжнароднае станoвішча для яе усе пагаршаецца. Навокал складаюцца новыя дзержауныя арганізмы, з якіх кожан па крысе адрэзае часткі яе тэрыторыі.

Чародным заданнем яе у відоку гэтаго павінна быць утварэнне моцнаго, адналітаго па духу, і ауторытэтнаго *нацыянальнаго прэдстауніцтва*. Мы абмінаем слова «улада», бо мусіць на яе ішчэ ні настау час. Улада павінна распасьцірацца на пэуную, устаноуляную у рубяжох тэррыторыю, мець прызнаныя за ею усім народам, ці яго большасьцю, а часам і дзержаунымі суседзямі, прэрогатывы. Гэтым пахваліцца ні можа пакуль што ні адна беларуская арганізацыя.

Залішне цяжкая гісторыя дала Беларусі—у найпатрэбнейшы для яе мамэнт замест чорнай здольнай да выгадавання буйных каласоу глебы—вялікае пяшчанае поле, асоблівыя пяшчынкі катораго усе ішчэ бягуць за ветрам. Трэба утрымаць гэтыя пяшчынкі, зьвязаць іх адна з другою і стварыць моцны зьвязаны грунт.

Тая арганізацыйная форма, у якую ад нідаунаго часу адліуся беларускі нацыянальны рух—рада рэспублікі і Сэкрэтарыят, здаецца нам ні адказуючай гэтым запатрэбаванням. Яна ні мае праудзівай сілы—каб быць уладай, чым хоча быць, і ганяючыся за уладай, ні робіць арганічнай працы над злучэнням народу.

Яна мусіць сабе гэта уясьніць і пайсьці іншай дарогаю. Праудзівае нацыянальнае *прэдстауніцтва*, ні адкідаючы нават прэдстауніцтва меншасьцяу, але як меньшасьцяу, можа зрабіць цяпер шмат болей карысьці для Беларусі, чым уроеная сабе ні праудзівая улада. Трэба атказацца ад ідэі улады, калі яе фактычне німа і устаць на дарогу заступніцтва за народ і яго інтэрэсы. Гэта ні значыло-б, што такое прэдстауніцтво ні магло-б спауняць нікаторых абавязкау улады: праз іх даць народу усю уладу—павінна быць яго мэтай.

Новая гісторыя зноу паустаючай Польшчы і адраздіушэйся Літвы дае для гэтаго найлепшыя прыклады.

Скрыпты шовіністы.

Мінская «Минская Мысль» шчыра узялася за адукацыю Рады і Сэкрэтарыяту. Паміж абвесткам аб опэрацце «Шалунья» і апошнімі весткамі с тэатру вайны раз-у-раз з'яуляюцца артыкулы, ў якіх рожные «мэтры» плянова выкладаюць думкі па дзержаўнаму праву і міжнароднай палітыцэ, спэцыяльна для ужытку «собирателей земли бѣлорусской». Што-ж, адукацыя рэч вялікая і па праудзі для нікаторых патрэбная.

Але нас цікавіць інтарэс дзеля якого так стараюцца паны з «М. М.» І аказуецца, што стараннe ідзець аб тым, каб стварыць на далей дружную супольную працу Рады і земскіх і гарадзкіх самауправаў, прэдстаўнікі каторых на сваей парадзе у прошлую пятніцу пастанавілі, бачьце «запрапанаваць Радзе пераглядзець пытанне аб нізалежнасьці Беларусі і пастанавілі арганізаваць «Областной Союзъ земствъ и городовъ Бѣлоруссіи». Бо гэтыя прэдстаўнікі-ж—ёсьць «прэдстаўнікі тутэйшых жаданняў, надзеяў патрэб і інтарэсаў», с чым «ні можа ні лічыцца Рада».

Шчыра спагадаючы нізалежнасьці Беларусі паны «мэтры» радзяць Радзе як найхутчэй прызнаць за сваёй граматай аб нізалежнасьці «значэнне толькі дэкляратыўнаго акту, выясняючаго пазыцыю Рады ў гэтым пытанню, і павіннаго быць разгледжаным і ухваленым Усебеларускім Устаноўчым Соймам».

Вось ў гэтым-жа увесь і інтэрэс, ў нізалежнасьці.

І ністолькі ў нізалежнасьці Беларусі наагул, як нізалежнасьці ад Расіі. Бо іначай ні рабілі-б яны поруч з разумнымі увагамі такіх ніразумных прапазыцыяў, як апошняя. Бо іначай ўспомнілі-б яны што той акт аб нізалежнасьці Украіны, які прачытаў проф. М. Грушэўскі у Малой Радзе (а ні на Устаноўчым Сойме п.н. прафэсары), чытаўся тагды, калі украінскія большэвіцкія фронтовікі разам з вялікарускімі таварышамі з усіх бакоў рушалі на Кіеў, меў так сама ні больш як дэкларатыўнае, фактычне, значэнне, покуль яго ні прызналі цэнтральныя дзержавы. І ні дрыжэлі-б так «за Беларусь» і ні пужалі-бы Раду абластным «Союзомъ земствъ и городовъ». Сучасныя «земствы» і «гарады», на Беларусі, вялікія майстры закладаць усякія «саюзы» і прыймаць рэзалюцыі. На жто другое, та можа не, а гэта яны могуць. Мікалаеўска-Ленінскія урады і Мураўёўскае «брацтво» надзялілі нас гэтымі, «дзячамі» ні толькі на «земствы» і «гарады», але нават на беларускія культурныя арганізацыі.

Гэта ведама нам панове беларускія Шульгіны.

А. Новадворскі.

Агульныя весткі.

РОТТЭРДАМ. У бэльгійскіх урадовых кругах занепакоены доляй бэльгійскай арміі у прыпакду адступлення англічан на палудзень.

ЛОНДОН. Лёрд Норсклiф, быў у міністра-прэзыдэнта Льлёйда Джоржа, і ад імі патрыотаў дамагаўся адстаўкі рады генэралаў, с прычыны таго, што левае крыло англіцкай арміі зусім ня споўніло усклаканых на яго надзей. Фэльдмаршалак Гэг зусім не ждаў наступленння.

Работнікі вестра выступаюць проці новых набораў.

Ходзяць чуткі, што Льлёйд Джордж прынцыпіальна згодзіўся зрабіць перамены ў ваеннай камандзі.

ПАРЫЖ (Гавас). Урадова 7. IV. Абстрэл Парыжу з дальнабойных гармат трываў і 6 красавіка. Ранены 3 асобы.

БЭРЛІН. Новыя ўдачы нямецкіх падводных лодак навакол Англіі: 18.000 тонн. Часць груза становіў транспорт каней дзеля Франціі.

БЭРЛІН. Агенцтво Гаваса апавешчае:

Француская міністэрства апавешчае гэткую заяву: калі Клемансо прыняў упраўленне, дык выявілося, што, на жаданне Аўстрыі, у Швэйцарыі адбываліся перагаворы між графам Рэвэртэрам, асабістым прыяцелям аўстрыяцкага імпэратара, і маёрам францускага генэральнага штабу. Арман, каторы быў послан дзеля гэтага б. францускім прэм'ер міністрам.

Клемансо лічыў, што майор Арман можэ атрымаць карысныя ведамасьці, і ня лічыў магчымым узяць на сябе адказ за перарыў гэтых перэгавораў. На жаданне графа Рэвэртэра Арман гэтак не раз езьдзіў у Швэйцарыю. Клемансо пры начальніку майора даў яму інструкцію: слухаць і нічога ні гаварыць. 25 лютага Рэвэртэра аддаў Арману заяву, каторая пачыналася гэтак: «У жніўні 1917 году пачаліся перэгаворы, каб атрымаць ад францускага ураду міравыя прэдлажэння дзеля Аўстрыі, каторыя Аўстрыя магла-бы паддзержаць перад бэрлінскім урадам».

БЭРЛІН. Торговай палаце ў Эссэне ў адказ на прывітальную тэлеграму Гіндэнбург між іншым пісаў у тэлеграме:

Здарэння апошняга часу паказалі, што наша пабеда — немінуча, — пабеда, каторая нам патрэбна дзеля забясьпечэння палітычнай і экономічнай будучыны Нямеччыны.

ПАРЫЖ. Ад пачатку абстрэлу Парыжу з дальнабойнай гарматы забіты 85 асоб.

ЖЭНЭВА. Гранатай з дальнабойнай гарматы забіты у Парыжы генэрал Франкфорт.

Выезд жыхараў с Парыжу на палудзень трывае далей.

БЭРЛІН. (В. Т. Б.). Адна з нямецкіх падводных лодак затапіла між Францыей і Англіей 6 параходаў і 2 парусьнікі разам ёмкасьцю на 22.000 тонн.

БЭРЛІН (В. Т. Б.) У заходняй часьці Сяродземнага мора нямецкія падводныя лодкі затапілі 7 параходаў і 13 парусьнікаў ёмкасьцю разам больш 25.000 тонн.

21 марца наша падводная лодка абстрэлівала італьянскі форт Чівіта Вэккія. Відаць былі пажары.

БЭРЛІН (В. Т. Б.). Нямецкія падводныя лодкі у поясе блокады навакол Англіі затапілі 6 параходаў ёмкасьцю разам 20.000 тонн.

ЛОНДОН. Англіцкае адміралтейство паказывае: 1 красавіка затануў англіцкі контрміналосец.

Курсы беларусазнауства

Сягоньні ЛЕКЦЫЯ

проф. д-ра МАССОНІУСА

па курсу: «ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЕ МОВЫ».

Пачатак лекцыі $6^1/_2$ гадз (сярэд.—Эуроп).

Весткі з Расіі.

БЭРЛІН. Шляхта Эстляндіі паслала нямецкаму імпэратару тэлеграму, ў каторай між іншым гаворыцца:

«Высказываем глыбокую ўдзячнасьць за вызваленне ад векавой няволі. Эстляндзкая шляха і земства маюць толькі адну надзею, што ім дадзена будзе магчымасць служыць Вашаму Вялічэству і вялікай нямецкай бацькаўшчыне.

ШТОКГОЛЬМ. (В. Т. Б.) 6. IV. Фінляндзкая глаўная кватэра апавешчая 6. IV. а 3 гадз. раніцай:

«Першая вялікая апэрація фінляндкай арміі закончэна. Чырвоная гвардзія ў Таммэрфорсе паддалася.

ГЭЛЬСІНГФОРС. 30 марца нямецкае міністэрство заграпічных спраў падало расійскаму ураду пратэст проці пасылкі падмогі чырвонай гвардзіі ў Фінляндзіі і зажадала ўзяцца с Фінлядзіі і пакараньня расійскіх войск, грозячы іначэй выступленнем.

ПЕЦЯРБУРГ. Некалькі зімаваўшых у Гангэ расійскіх ваенных судзён, у тым ліку 4 падводные лодкі, паўзрывалі сябе, каб не папасьці ў нямецкія рукі.

КОНСТАНТЫНОПОЛЬ. На каўказскім фронці заняты Сарыкамыш. Расійскіе банды прасьледуюцца ў кірунку Карсу. Турэцкіе войскі йдуць на Батум.

ПЕЦЯРБУРГ. (Рэйтер) Маніфест рады народных камісараў вінаваціц Японію у жаданьні загубіць народную рэспубліку і заўладаць Сібірам. Японія абвешчвенца за сьмяротнага ворага Расіі. Расійскі урад трэбуе ад саюзьнікаў аб'ясненьне і пяпярэджывае, што іх адказ адаб'ецца на ўсей заграпічнай палітыцэ Расеі.

ПЕЦЯРБУРГ. Рада народных камісараў апавэшчае сваю пастанову пакінуць бэз ніякай увагі высадку немцаў у Фінляндзіі, пакуль іх опэраціі ня выйдуць за межы гэтай незалежнай старонкі.

ПЕЦЯРБУРГ. «Наш век» паказывае з Маскы, што ўрад згодзіўся на апавешчэньне татарскай рэспублікі, каторая будзе ў саюзе за урадам саветаў.

МАСКВА. (П. Т А.) 4.IV. Урад паслаў украінскаму ураду паведамленьне аб згодзі пачаць міравые перэгаворы з Украінай; ён прэдлагае пачаць перэгаворы у Смаленску. Разам с тым савецкі урад пратэстуе проці заявы, бытцым між Расіяй і Украінай ішла вайна. Барацьба йдзе выключна між: дзьвема партіямі украінскаго народу, і гутарка можа існці толькі аб гарачых сымпатыях работнікаў Рэсіі да работнікаў і селян Украіны.

ПЕЦЯРБУРГ. «Ізвестія» паказываюць, што між урадам і амэрыканскім агентам Джонсомам ідуць перэгаворы аб прадажы Камчаткі.

МАСКВА. (П. Т. А.) Пацьверджаюцца весткі аб назначэньні Іоффэ за пасла ў Бэрлін і Каменева ў Вену.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкага вярхоунаго камандавання за 10 красавіка 1918 року.

ЗАХАД:

Наміж Армантьерам і каналам Ля-Бассэ пасьля моцнаі артылерыйскаі і мінаметнаі падгатоўкі перарвалі мы ангельскія і португальскія пазыцыі і забралі першую лінію. 6000 палонных і каля 100 гарматау. На абодвых баках Соммы разьвіваецца мацнейшы артылерыйскі бой і пяхотныя атакі. На паўднёвым беразі Уазы мы адкінулі віпрыяцеля назад за канал Уазу-Эн, наміж Фолепбры і Бляпкур.

УСХОД:

Нашае войска, што высадзілося каля рэкі Ганго, пасьля кароткаі бітвы з бандамі, заняло вакзал ў Карыс.

УКРАІНА:

Харкоў, пасьля кароткаго бою. 8/IV забраны.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар

фон-Людэндорф.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Акцызнаму упрауленню Менскай губэрні няме кае начальство заявіло, што яны нічога німаюць проціу істнування яго, але расходы свае павінны пакрываць толькі з акцызнаго даходу.

Варшаускае эканамічнае таварыство (Петрапаулауская, 8), якое мело ужо ліквідаваць сваю працу, застаецца на далей і будзе абслужываць патрэбы афіцэрау і іх сямейсты.

Пры афіцэрскім бюро аткрываецца аддзел тэхнічны, каторы мае выкарыстаць тэхнічныя здольнасьці афіцэрау, бяручыя на сябе розныя спэцыяльныя работы.

Кансультацыя прысяжных адвакатау пры акружным судзе на будучым тыдні пачынае сваю працу. Падгатоукай для гэтаго заняліся тры адвакаты с прысяжным Брадоускім на чале. Цяпер ідзе чыстка памешкання пасьля большэвіцкіх гасьцін.

Жалезнадарожныя весткі. З Украіны вярнууся інжэнер Крыжаноускі—начальнік руху Л. Р. ж. д., каторы езьдзіу туды бараніць справу участка Гомель-Ромны. Але з гэтаго нічога ня вышло. Участак гэты адойдзе да Палескай дарогі; аб гэтым старалося нат само упрауленне Палескіх ж. д.

Гэткім парадкам упрауленне Л. Р. ж. д. можэ разваліцца, а упрауленцам-служачым прыдзецца шукаць сабе новых мейсц.

Сталыя цэны, якія намеціла Гарацкая Дума 8-го красавіка:

1 п. ауса		13 р.
1 п. жыта		28 р.
1 ф. свечак	4 р.	50 к.
„ мыла	1 р.	60 к.
1 п. картофлі	4 р.	50 к.
1 ф. грычаных круп		60 к.

Гарбаты за фунт—до 10 р. прыбаука 20%, даражэйшую—прадаваць па цане на этыкеце.

Прысяжны адвакат Чаусау па выбару гарадской Думы гэтымі днямі выежджае у Несьвіж разгледзіць на мейсцы справу гласнаго Несвіжскай думы Глаубэрзона, каторага адв. Чаусаву прыдзецца бараніць.

Ліквідацыйнае упрауленне У. З. С., якое перайшло пад загад Менскаго Губ. Камітэту, мае трымацца да таго часу, пакуль ні выплаце абяцаных ішчэ да акупацыі пэнсый усім сваім служачым.

Расплата с служачымі паднецца гэтымі днямі, бо немцы, выручыушы да 3.000.000 губл. са складау у Кашарах У. З. С., маняцца перадаць гэтыя грошы ліквідацыйнаму упрауленню.

Гарацкая Управа атрымала урэшці на свае канешныя выдаткі ад гарацкога харчоваго камітэту 200.000 рублеу.

З гэтых грошэй даплачаны пэнсыі служачым за сакавік, а так сама будзе выдана 7000 р. Беларускай Радзе.

Дзеля эканоміі харчоу нямецкая камэндантура раіць усім безработным выежджаць на вясковыя заработкі. У гэтай справе ідуць перагаворы паміж нямецкім начальствам і гарацкім самаупрауленням.

Камітэт грамазднай абязпекі узяуся ужо за ліквідацыю сваіх спрау. А спрау гэтых німало: камісыя аб безработных, камісыі барацьбы з даражыней, са спэкуляцыяй, камісыі санітарныя, гігіэнічныя і т. д., і разумеецца, усе гэтыя камісыі нічога добраго і сталаго нізрабілі.

Гарацкая Управа мае звольніць ад службы да 40 душ, найменш, разумеецца, здатных да працы. А такіх там хапае, і тым больш непатрэбны яны, што павялічэнне штату служачых было зробляно ішчэ у часе вайны, калі праца у думе, само сабой, была іншая.

Нехват грошэй у акружным судзе спыняе нармальную яго працу. Судзебныя следавацелі, прімерам, якія назначаюцца у паветы—не атрымовываюць належнай на дарогу падмогі і гэта ставіць іх у цяжкое палаженне, што дрэнна адбіваецца на данныя ім паручэння.

Рэдактар А. Прушынскі.

Выдавецтва Т-ва «Заранка».

АБВЕСТКІ.

Друкарня Я. А. Грымбліята.